**М. М. Воінава-Страха**

# АКСІЯЛАГІЧНАЯ ПРАБЛЕМАТЫКА Ў АПОВЕСЦЯХ А. КАЗЛОВА

Сучасная беларуская літаратура надзвычай чуйна рэагуе на працэсы, якія адбываюцца ва ўсіх кірунках грамадскага жыцця, па-мастацку выразна акцэнтуючы ўвагу на найбольш надзённых праблемах. XXI стагоддзе, якое, з аднаго боку, стварыла чалавецтву ўмовы для максімальна эфектыўнай рэалізацыі свайго патэнцыялу і дасягнення наваякасных рознаўзроўневых вяршынь, з другога ж, істотна ўскладніла працэс засваення класічнай аксіялагічнай сістэмы, што вякамі забяспечвала трывалы фундамент развіцця грамадства. Імклівасць і хуткаплыннасць новага стагоддзя абумовілі змену парадыгмы каштоўнасцей: “канфлікт” паміж духоўнымі і матэрыяльнымі каштоўнасцямі ярчэй за ўсё адлюстроўвае сучасную рэчаіснасць, што, несумненна, знаходзіць водгук і ў тэкстах сучаснай беларускай мастацкай літаратуры. Новая эпоха спарадзіла сітуацыю, у якой маральна-этычная і духоўная аснова асобаснай і грамадскай экзістэнцыі праходзіць праз складаную сістэму фільтраў і верыфікацыі на прадмет адпаведнасці новай карціне свету і трываласці ў працэсе сутыкнення са шматлікімі, часам нечаканымі, выклікамі сучаснасці. У акрэсленым кантэксце адбываецца віда-вочная актуалізацыя аксіялагічнай праблематыкі, абвастраюцца пытанні вызначэння кірункаў развіцця сістэмы каштоўнасцей на самых розных узроўнях – агульначалавечых, нацыянальных і асобасных.

Важнае значэнне для мастацкага асэнсавання вышэйзгаданай праблемы мае выбар прыдатнага жанру, які б дазволіў хутка і ў даступнай для чытача форме данесці тую ці іншую думку ці ідэю. У існуючай жанравай сістэме вышэйпералічанымі здольнасцямі надзелена малая проза, напрыклад, навела, апавяданне, мініяцюра ці іх камбінаваныя формы. Крыху саступае ім у мабільнасці аповесць, аднак, і яна ўтрымлівае пазіцыі аднаго з запатра-баваных у чытачоў жанру.

Адным з яркіх майстроў аповесці ў прасторы айчыннага прыгожага пісьменства XXI стагоддзя з’яўляецца Анатоль Казлоў (1962–2023). Мастац-кая спадчына пісьменніка прадстаўлена зборнікамі “Міражы ценяў” (1990), “І тады я памёр…” (1993), “Незламаная свечка” (2000), “Юргон” (2006), “Горад у нябёсах” (2009), “Той, хто абганяе сны” (2014). Выяўленне адмет-насцей мастацкага асэнсавання аксіялагічнай праблематыкі ў творчасці А. Казлова дае магчымасць не толькі зразумець уплыў сучаснага соцыума а станаўленне асобы, але і вызначыць магчымыя спосабы захавання агульна-чалавечых каштоўнасцей у перыяд глабальных выклікаў і перамен.

Творы аўтара вылучаюцца выразным спалучэннем у кантэксце сучасных беларускіх рэалій сінкрэтычнага, рацыянальнага, рэлігійнага і містычнага тыпаў свядомасці, праявы якіх дазваляюць выявіць комплекс актуальных як у нацыянальным, так і агульначалавечым аспекце шэраг аксіялагічных праблем, з якімі вымушана сутыкнуцца грамадства ў ХХІ стагоддзі.

Важную ўвагу пісьменнік надае праблеме дэфармацыі маральна-этычных каштоўнасцей, якая даўно актуалізавалася ў сучасным грамадстве. Напрыклад, у аповесці "Распяцце, альбо Ці ж баліць галава ў вароны" А. Казлоў закранае адначасова некалькі праблем. Так, у шэраг традыцыйна замацаваных за бацькамі абавязкаў уваходзіць выхаванне дзяцей згодна з тым маральна-этычным кодэксам, які спрадвеку ўкараніўся ў карціну свету таго ці іншага народа (нацыянальныя каштоўнасці) і чалавецтва ў цэлым (універсальныя каштоўнасці). У згаданым творы аўтар з дапамогай разнастайных сродкаў выразнасці прадстаўляе дэфармацыю гэтай сістэмы. Манька, як маці, дбае пра дабрабыт сваёй дачкі, аднак, ажыццяўляе свой клопат у сістэме каардынат, цалкам супрацьлеглых агульнапрынятым нормам маралі: "Плаці, хлопец, і ідзіце пазабаўляйцеся" (А. Казлоў).

Плюралізм, свабода волі, неабмежаванасць магчымасцей, біблейскія запаветы інтэрпрэтуюцца героямі аповесці ў скажона-вычварным фармаце: "Цяперака кожны чалавек жыве як можа, на што здатны"; "…не саграшыш – не пакаешся, а не пакаешся – не саграшыш. Так што, Казіміраўна. пакуль можаш – грашы, пакаяцца заўсёды паспееш" (А. Казлоў). Такія ўстаноўкі героі аповесці выбіраюць не толькі ў якасці асновы ўласнай жыццёвай пазіцыі, але і транслiруюць іх сваім дзецям як норму.

Вастрыня трагізму заснавана на кантрасце звыклага ладу жыцця згодна дэфармаванай сістэмай асобасных каштоўнасцей і не да канца страчанага ўсведамлення яе разбуральнасці: "Ляжаць мае дубочкі-саколікі ў сырой зямлі, а я ўсё жыву, капчу белы свет. Сама сабе абрыдла, перад людзьмі сорам згубіла" (А. Казлоў). Каштоўнасць жыцця, згодна з пазіцыяй А. Казлова, абумоўліваецца наяўнасцю ў ім адпаведнага сэнсу. Дэмаралізацыя, адсутнасць волі і жадання пераўзысці свае слабасці непазбежна вядуць у нябыт.

Не пакідае па-за ўвагай пісьменнік і праблему захавання каштоўнасці кахання. Жыццёвая гісторыя Манькі і яе дачкі ("Распяцце, альбо Ці ж баліць галава ў вароны") – сведчанне таго, як моцны дысбаланс паміж духоўным і матэрыяльным аспектамі прыводзіць да самазнішчэння: "Па мне дочка, па мне пайшла, абы з кім не абдымецца. <…> Цяперака мне падавай не красаўчыка, а мужчынку, у якога грошай, што блох у пляшывага сабакі…" (А. Казлоў). Навідавоку не толькі падмена паняццяў – каханне як універсальная каштоўнасць і як аб'ект таварна-грашовых адносін, – але і прыклад парушанай духоўнай узаемаповязі паміж бацькамі і дзецьмі.

Неад'емнай ад вышэйакрэсленай з'яўляецца тэма захавання гарманічных узаемаадносін, заснаваных на вернасці, адданасці і ўзамапавазе ("Перакуліся перакуленае"). Пасля ад'езду з роднай вёскі з прычыны паступлення ў тэхнікум Лёнік распачаў новае жыццё, галоўная жаночая роля ў якім належала ўжо

іншай дзяўчыне – Вераніцы. Дуняша ж з яе марамі і спадзяваннямі засталася ў адзіноце, безнадзейна спрабуючы выстаяць у няроўным сутыкненні з людскай ганьбай. Яе няспраўджаныя мары ўладкаваць асабістае жыццё, з аднаго боку, выклікаюць спачуванне, з іншага ж, выступаюць чарговым сведчаннем прыярытэту каштоўнасці адносін, у аснове якіх ляжыць шчырасць і праўдзівасць.

Тэма дэфармаваных сямейных каштоўнасцей скразная ў творчасці А. Казлова. Яна раскрываецца пісьменнікам з самых розных ракурсаў. Так, у аповесці "Дзеці ночы" паказваецца лёс сям'і Гуронаў, якая з'яўляецца прыкладам выразнага кантрасту ўяўнага знешняга дабрабыту і рэальнага ўнутранага разладу, што і прыводзіць іх сына Максіма на небяспечны шлях асобаснага разбурэння. Пашкоджаная сістэма бацькоўска-дзіцячых адносін вымушае прадстаўнікоў моладзі (Нінка, Вілен, Максім і яго паслядоўнікі "гуронаўцы") апынуцца хоць і ў розных ролях (ахвяры ці карніка), але ў аднолькава нябеспечнай асацыяльнай прасторы.

Выразна прасочваецца на старонках аповесцей А. Казлова і ідэя аб важнасці ўсведамлення каштоўнасці родавай пераемнасці, захавання народных векавых традыцый, вызначэння нацыянальнай самаідэнтыфікацыі. Прыклад парушэння родавай повязі назіраецца ў аповесцях "Дзеці ночы", "Распяцце, альбо Ці ж баліць галава ў вароны", "Горад у нябёсах". "Жыхары Зямлі" Антак і Светка з аповесці "Горад у нябёсах" занепакоены праблемай нацыянальнага самавызначэння, годнасці народа, пытаннямі духоўнай спустошанасці і маральна-этычнага заняпаду сучаснікаў, а галоўная роля прадстаўленага ў творы "свету Продкаў" бачыцца ў тым, каб "не дазволіць людзям згубіць дарэшты створанае пакаленнямі мільёнаў папярэднікаў" (А. Казлоў).

Адметная рыса мастацкага стылю А. Казлова – безацэначнасць учынкаў герояў. Ён стварае пэўную мадэль патэнцыяльна пагрозлівых наступстваў парушэння адвечна існуючага маральна-этычнага кодэксу для таго, каб сфарміраваць чытачу прастору для рэфлексіі і самааналізу. Аўтар не сцвярджае безапеляцыйны прыярытэт духоўных каштоўнасцей над матэрыяльнымі. Ён паказвае магчымы знішчальны – для асобы, у прыватнасці, і грамадства, у цэлым, – вынік парушэння балансу паміж гэтымі двума важнымі аспектамі ў жыцці чалавека.